Наименование ТВП: Беловежская пуща



© И. Бышнёв

Код: BY009

Географические координаты: 52°39' N 24°54' E

Административная принадлежность: Брестская область: Каменецкий район, Пружанский район, Гродненская область: Свислочский район

Площадь: 85036 га

Критерии: B2, B3

Национальный природоохранный статус: Нацыянальны парк «Белавежская пушча»

Международный природоохранный статус: ТВП рэгіянальнага значэння, утворана ў 1998 годзе. Ключавая батанічная тэрыторыя. Біясферны рэзерват ЮНЭСКА МАВ З 1992 г. уключана ў спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Общее описание:

Белавежская Пушча – буйнейшы і адзіны з тыповых некалі ў Еўропе, масіў пярвічных лясоў, які захаваўся да сённяшніх дзён. Беларуская частка нацыянальнага парка мяжуе з польскай. Захаванню гэтых унікальных мясцін садзейнічала тое, што ў розныя эпохі яны з’яўляліся традыцыйным месцам палявання літоўскіх, польскіх і рускіх каранаваных і іншых высокапастаўленых асоб. У адрозненне ад іншых лясных масіваў раўнінай Еўропы, Белавежскія лясы

захавалі амаль што першабытны выгляд. Пакуль яшчэ даволі шматлікія некранутыя ўчасткі Пушчы даюць прытулак цэламу комплексу характэрных жывёл і раслін. Незвычайная для Беларусі і ўзроставая структура лясоў. Пры агульным сярэднім узросце лясоў пушчы 90 гадоў, асобныя участкі лесу маюць сярэдні узрост 250 – 350 гадоў, нярэдка сустракаюцца 500-600-гадовыя дрэвы. Белавежская Пушча – адзіны ў Еўропе лясны масіў, у якім больш за тысячу шматвекавых дрэў.

Лясы і хмызнякі пакрываюць 82,9% працэнты тэрыторыі нацыянальнага парка, сярод іх пераважаюць хваёвыя, але, увогуле, можна сустрэць усе асноўныя тыпы лесу, характэрныя для гэтага геаграфічнага рэгіёна. Першабытнасць Пушчы падкрэсліваецца значнай доляй карэнных ясеневых, ліпавых, кляновых лясоў, старых алешнікаў.

Яшчэ трыццаць гадоў назад усходняя частка Пушчы была акружана буйнымі асаковымі балотамі, большасць з якіх цяпер асушана. Да нашых дзён захаваўся толькі адзін вялікі масіў балот – Дзікое. Асушэнне балот з’явілася адной з прычын парушэння гідралагічнага рэжыму Пушчы, што прывяло да шэрагу адмоўных вынікаў.

Белавежская Пушча знаходзіцца ў басейне ракі Вісла. З поўначы і паўднёвага ўсходу да яе прымыкаюць басейны рэк Нёман і Прыпяць, прычым водападзел Балтыйскага і Чорнага мораў праходзіць у непасрэднай блізкасці ад межаў Пушчы. Праз яе тэрыторыю працякае шмат невялікіх рэк і рэчак, многія з якіх бяруць пачатак у самой Пушчы ці ў непасрэднай блізкасці ад яе. Самая вялікая рака Нараў выцякае з балота Дзікое. Важнейшы прыток Нарава ў межах Пушчы – рака Нараўка, выток якой – балота Дзікі Нікар – было асушана, а сама рака каналізавана. Па паўднёвай частцы нацыянальнага парка працякае рака Правая Лясная з прытокамі Белая і Перавалока. Натуральных азёр на тэрыторыі няма. З дзесяці штучных вадасховішчаў найбольш буйныя створаны ў пойме ракі Перавалока на месцы былога нізіннага балота і луга: Лядское (345 гектараў) і Хмялеўскае (75 гектараў). Спрамленне рэк таксама аказала істотны адмоўны ўплыў на гідралагічны рэжым лясного масіву.

У нацыянальным парку пераважаюць наступныя віды гаспадарчай дзейнасці: абмежаваныя лесанарыхтоўкі, паляўнічы і экалагічны турызм.

Разнастайнасць глебы Белавежскай пушчы спрыяе відавому багаццю флоры: на яе тэрыторыі сустракаецца больш за 1000 відаў сасудзістых раслін, 62 віда з якіх занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Акрамя таго, тут адзначана каля 300 відаў

лішайнікаў, 270 – мхоў, 3000 – грыбоў.

Основные биотопы:

Тэрыторыя нацыянальнага парка уяўляе сабою буйны массів адносна мала парушанай прыроднай расліннасці якая прадстаўлена пераважна сярэдне і стараўзроставымі лясамі з асобнымі ўчасткамі адкрытых балот і лугоў. Плошча натуральных, альбо слаба парушаных экасістэім складае каля 95% тэрыторыі. Дамінуючым тыпам экасістэм з'яўляюцца лясныя, сярод якіх пераважаюць хвойна-шырокалістныя лясы.

Невялікая плошча ТВП занята адкрытымі водна-балотнымі экасістэмамі, прадстаўленнымі балотамі, рэкамі і вадасховішчамі (рэкі, каналы, вадасховішчы – 0,6%).

Лугі якія займаюць некалькі працэнтаў ад плошчы ТВП (4,6%), характэрызуюцца значнай разнастайнасцю расліннага і жывёльнага свету. Большая частка з іх выкарыстоўваецца для сенакашэння, альбо як пашы. У апошнія гады плошча сенакашэння значня паменшылася, што вядзе да зарастання лугоў хмызнякамі.

Кустарнікавыя экасістэмы займаюць каля 1% тэрыторыі, пераважаюўь лаза і ядловец.

Птицы:

У беларускай часцы Белавежскай пушчы налічавеца 253 віда птушак, якія хоць бы аднойчы зарэгістраваны на яе тэрыторыі і ў бліжэйшых наваколіцах (вадаахоўная зона). З іх на гнездаванні прынамсі аднойчы адзначана (альбо гнездаванне мяркуеца) для 184 відаў. Толькі на міграцыі сустракаеца 39 відаў, толькі на зімоўцы – 7 відаў, залётных відаў 22 і 1 від няўдала акліматызаваны.

ТВП Белавежская пушча мае рэгіянальнае значэнне для захавання многіх лясных відаў птушак. Сярод іх чорны бусел *Ciconia nigra,* звычайны асаед *Pernis apivorus,* шэрая кугакаўка *Strix aluco* і баравы жаўрук *Lullula arborea.* Па колькасці пар малога арлеца *Aquila pomarina* Белавежская пушча адна з самых “багатых” ТВП.

Другие группы животных:

Сярод іншых пазваночных Пушчы – 59 відаў млекакормячых, 31 – рыб, 11 – земнаводных, 7 – паўзуноў. Красой і гордасцю пушчанскіх лясоў з’яўляецца зубр *Bison bonasus*. Гэта самая буйная жывёліна на еўрапейскім кантыненце, якая жыла тут яшчэ ў перыяд мамантаў і шарсцістых насарогаў. Сёння ў нацыянальным парку налічваецца каля 400 зуброў.

Состояние редких видов птиц:

Виды	Статус	Количество	Год/период оценки	Точность оценки	Тренды (2000-2008)	Критерий ТВП
Гусь серый *Anser anser*	гн	4-7 п	2004-2011	Э	↔	
Шилохвость *Anas acuta*	мг	+	2003-2008	П		
Луток *Mergus albellus*	мг	+	2003-2008	П		
Крохаль длинноносый *Mergus serrator*	мг	+	2003-2008	П		
Крохаль большой *Mergus merganser*	мг	+	2003-2008	П		
Поганка серощекая *Podiceps grisegena*	гн	1 п	1997	Т		
Выпь большая *Botaurus stellaris*	гн	7-20 с	2003-2008	Т	↑	
Выпь малая *Ixobrychus minutus*	гн	5-10 с	2003-2008	Э		

Виды	Статус	Количество	Год/период оценки	Точность оценки	Тренды (2000-2008)	Критерий ТВП
Цапля большая белая *Casmerodius albus*	мг	+	2003-2008	П		
Черный аист *Ciconia nigra*	гн	25-30 п	2003-2008	Э	↔	B2
Осоед обыкновенный *Pernis apivorus*	гн	> 80 п	2003-2008	Э		B3
Коршун черный *Milvus migrans*	гн?	+	2003-2008	П		
Коршун красный *Milvus milvus*	гн?	1-2 п	2003-2007	П	↓	
Орлан-белохвост *Haliaeetus albicilla*	гн	2-3 п	2003-2007	Т	↑	
Змееяд *Circaetus gallicus*	гн	+	2003-2008	П		
Лунь полевой *Circus cyaneus*	гн	+	2003-2008	П		
Малый подорлик *Aquila pomarina*	гн	55-60 п	2008	Т	↔	B2
Подорлик большой *Aquila clanga*	гн	0-1 п	2008	Т	↔	
Орел-карлик *Aquila pennata*	гн?	0-3 п	2003-2007	Т		

Виды	Статус	Количество	Год/период оценки	Точность оценки	Тренды (2000-2008)	Критерий ТВП
Скопа *Pandion haliaetus*	мг	+	2003-2008	П		
Пустельга обыкновенная *Falco tinnunculus*	гн	5-8 п	2003-2007	Т	↔	
Кобчик *Falco vespertinus*	мг	+	2003-2008	П		
Дербник *Falco columbarius*	мг	+	2003-2008	П		
Чеглок *Falco subbuteo*	гн	3-5 п	2003-2007	Т	↓	
Балобан *Falco cherrug*	зал	1 ос	2008	П		
Погоныш малый *Porzana parva*	гн?	1 с	2003	П		
Коростель *Crex crex*	гн	150-200 с	2003-2008	Э	↔	
Журавль серый *Grus grus*	гн	30-35 п	2003-2008	Э	↔	B2
Галстучник *Charadrius hiaticula*	мг	+	2003-2008	П		
Ржанка золотистая *Pluvialis apricaria*	мг	+	2003-2008	П		
Турухтан *Philomachus pugnax*	мг	+	2003-2008	П		

Виды	Статус	Количество	Год/период оценки	Точность оценки	Тренды (2000-2008)	Критерий ТВП
Гаршнеп *Lymnocryptes minimus*	мг	+	2003-2008	П		
Веретенник большой *Limosa limosa*	гн	+	2003-2008	П		
Улит большой *Tringa nebularia*	мг	+	2005-2008	П		
Поручейник *Tringa stagnatilis*	мг	+	2003-2008	П		
Чайка малая *Hydrocoloeus minutus*	мг	+	2005-2008	П		
Чайка сизая *Larus canus*	мг	+	2005-2008	П		
Крачка малая *Sternula albifrons*	гн	0-1 п	2003-2007	Т		
Крачка белощекая *Chlidonias hybrida*	гн	2-3 п	1999	Т		
Филин *Bubo bubo*	гн	8-12 с	2005-2007	Т	↔	
Сыч воробьиный *Glaucidium passerinum*	гн	195-240 с	2005-2008	Э	↔	
Сыч домовый *Athene noctua*	гн	+	2003-2008	П		

Виды	Статус	Количество	Год/период оценки	Точность оценки	Тренды (2000-2008)	Критерий ТВП
Неясыть бородатая *Strix nebulosa*	гн	0-2 п	2005-2007	Т	↔	
Неясыть серая *Strix aluco*	гн	240-320 с	2005-2007	Э	↔	В3
Сова болотная *Asio flammeus*	гн	5-10 п	2003-2008	Э		
Обыкновенный зимородок *Alcedo atthis*	гн	1-5 п	2003-2008	Э		
Козодой обыкновенный *Caprimulgus europaeus*	гн	> 350 п	2005-2007	Э		
Дятел зеленый *Picus viridis*	гн	5-10 п	2003-2008	Э		
Дятел белоспинный *Dendrocopos leucotos*	гн	150-250 п	2003-2008	Э	↔	
Дятел трехпалый *Picoides tridactylus*	гн	50-100 п	2003-2008	Э	↔	
Жаворонок хохлатый *Galerida cristata*	гн	1-3 п	2003-2008	П		
Жаворонок лесной *Lullula arborea*	гн	> 200 п	2003-2008	Э		В3

Виды	Статус	Количество	Год/период оценки	Точность оценки	Тренды (2000-2008)	Критерий ТВП
Конек полевой *Anthus campestris*	гн	+	2003-2008	П		
Мухоловка-белошейка *Ficedula albicollis*	гн	+	2003-2008	П		
Синица усатая *Panurus biarmicus*	мг	+	2002	П		
Сорокопут чернолобый *Lanius minor*	гн	+	2003-2008	П		
Овсянка садовая *Emberiza hortulana*	гн	15-20 п	2004-2005	Э	↔	

Другие редкие и находящиеся под угрозой исчезновения виды:

Звяры: начніца Натэрэра *Myotis nattereri*, начніца Брандта *Myotis brandtii*, еўрапейская шыракавушка *Barbastella barbastellus*, малая вячэрніца *Nyctalus leisleri* , паўночны кажанок *Eptesicus nilssonii*, соня-палчок *Glis glis*, садовач соня *Eliomys quercinus*, арэшнікавая соня *Muscardinus avellnarius*, еўрапейская рысь *Lynxlynx*.

Птушкі: чапля-кваква *Nycticorax nycticorax,* гусь-піскулька *Ansererythropus*, белавокая чэрнець *Aythyanyroca*, сокал-падарожнік *Falcoperegrinus*, палянік *Burhinusoedicnemus*, дубальт *Gallinagomedia,* вялікі кулён *Numeniusarquata,* сіпуха *Tytoalba*, даўгахвостая кугакаўка *Strixuralensis*, сіні сіваграк *Corciasgarrulous*(гэтыя віды адзначаны для тэрыторыі Белавежскай пушчы, але ў апошнія 10-15 год не сустракаліс).

Амфібіі: грабеньчаты трытон*Triturus cristatus*, чаротавая рапуха *Bufocalamita.*

Рэптыліі: мядзянка *Coronellaaustriaca*.

Насякомыя: бронзавы красацел *Calosomainquisitor*, пахучы красацел *Calosoma sycophanta*, рашэцісты жужаль *Carabuscancellatus*, жужаль менетрые *Carabus menetriesi*, фіялетавы жужаль *Carabusviolaceus*, шчыгрынавы жужаль *Carabus coriaceus*, блытаны жужаль *Carabus intricatus*, рабрысты слізняед *Chlaenius costulatus*, баразнаваты слізняед *Chlaenius sulcicollis*, жук-алень *Lucahuscervus*, валасаты стафілін *Emushirtis*,двухпалосны падвадзень *Graphoderus bilineatus* ,малінавая ордэнская стужка *Catocalasponsa*, тарфянікавая жаўтушка *Coliaspalaeno* і іншыя.

Павукі: вялікі сплаўны павук *Dolomedesplantarius*.

П’яўкі: медацынская п’яўка *Hirudomedicinalis.*

Расліны: піхта белая *Abies alba*, дуб скальны *Quercus petraea*, плюшч звычайны *Hedera helix*, жаўтазель германскі *Genista germanica*, вярба чарнічная *Salix myrtilloides*, званок лілеялісты *Adenophora liliifolia*, астранцыя вялікая *Astrantia major*, венерын чаравічак сапраўдны *Cypripedium calceolus*, касач сібірскі *Iris sibirica*, раўнаплоднік пылюшнікавы *Isopyrum thalictroides*, кадзіла сармацкае *Melittis sarmatica*, першацвет высокі *Primula veris*, пярэсна еўрапейская *Trollius europaeus* і іншыя.

Угрозы:

Асноўнай і найбольш значнай пагрозай з’яўляецца рэканструкцыя мелеаратыўных сістэм на тэррыторыі і ў ваколіцах лясного массіву.

Знішчэнне падросту дзікімі капытнымі, колькасць якіх значна павялічылася ў выніку зімовай падкормкі і адстрэлу ваўкоў.

Лесагаспадарчая дзейнасць. Пасля пераўтварэння запаведніка ў нацыянальны парк лесагаспадарчая дзейнасць на яго тэрыторыі значна пашырылася. Гэта стала адным з істотных фактараў адмоўнага ўздзеяння на экасістэмы.

Хімічнае забруджванне. Белавежская Пушча знаходзіцца на мяжы трансгранічнага пераносу паветраных мас і з’яўляецца натуральным бар’ерам на шляху міграцыі забруджваючых рэчываў. У выніку, на яе тэрыторыі асядаюць многія цяжкія металы.

Нарыхтоўкі ягад, грыбоў і лекавай сыравіны зніжаюць кармавую базу жывёл, а таксама з’яўляюцца фактарам парушэння іх спакою.

Паляванне на ваўкоў, што спрыяе утрыманню высокай шчыльнасці капытных.

Зімовая падкормка капытных жывёл.

Рекомендации по сохранению:

Павелічэнне запаведнай зоны да 90 тыс. га (уся тэрыторыя былога запаведніка).

Аднаўленне балотных массіваў па перыферыі НП (Дзікі Нікар, Глубенец, пойма рэк Лясная Левая і Лясная Правая).

Забоарона на рэканструкцыю меліяратыўных сістэм на тэрыторыі пушчы і ў яе вадаахоўнай зоне.

Забарона на палявання на ваўкоў.

Забарона на падкормку капытных жывёл, акрамя зубра.

Перыядычнае кашэнне на с/х землях і лугах у вадаахоўнай зоне.

Источники информации:

Асабістыя паведамленні: Пракапчук В.В.

Черкас Н. Д., Абрамчук А.В. Новые сведения об орле-карлике (Hieraaetuspennatus) в Беловежской пуще. //Леса Евразии в XXI веке. Мат. IV междунар. конф. молодых ученых.

Абрамчук А.В. Современный видовой состав орнитофауны национального парка “Беловежская пуща”. //”Четвертые научные чтения памяти В.В. Станчинского”. Сборник докладов. – Смоленск, 2004. – С. 27-31.

Abramczuk A.W. 2004 Nowe gatunki ptakow obserwowane w Puszczy Bialowieskiej //Parki nar. Rez. Przyr. 23: 629-631.

А.В. Абрамчук Видовой состав отряда совообразные (Strigiformes) Беловежской пущи. // Тез. Докл. науч. конф. 13-14 декабря 2002 г. УО "ВГУ им. П.М. Машерова" – Витебск: Изд-во УО "ВГУ им. П.М. Машерова". 2005. – с.

Абрамчук А.В. Численность и распространение бородатой неясыти (StrixnebulosaF., 1772) в Беловежской пуще. // Антропогенная динамика ландшафтов, проблемы сохранения и устойчивого использования биологического разнообразия: материалы III Респ. науч.-практ. конф., Минск, 19-20 окт. 2006 г. / Бел. гос. пед. ун-т им М. Танка; редкол. М. Г. Ясовеев [и др.]; отв. ред. И.Э. Бученков, А.В. Хандогий. – Минск: БГПУ, 2006. – С. 20-22.

Абрамчук А.В., Прокопчук В.В. Численность и распространение домового сыча (Athenenoctua) в Каменецком районе Брестской области // «Актуальные проблемы экологии – 2006» Международная научно–практическая конференц 22 – 24 ноября 2006 года: [Материалы]. Гродно, 2006.

Абрамчук А.В. Миграция водно-болотных птиц в Беловежской пуще // Беловежская пуща. Исследования. – Брест, Академия, 2006. – Вып.12. – С.164-182.

А.В. Абрамчук. Бородатая неясыть в Беловежской пуще //Совы Северной Евразии: экология, пространственное и биотопическое распределение. /Под ред. Волков С.В. (гл. ред.), Шариков А.В., Морозов В.В. — М.:. 2009. С. – 128-131.

Абрамчук А.В., Черкас Н.Д. Птицы Беловежской пущи: систематический список. Subbuteo Том 10,

Абрамчук А.В. Кадастровая оценка популяций сов Беловежской пущи// Природные ресурсы №4, 2007. С – 48-54.

Абрамчук А.В., Черкас Н.Д. Современное состояние редких и охраняемых видов птиц в Беловежской пуще //Прыроднае асяроддзе Палесся: асаблівасці і перспектывы развіцця.Матэрыялы Міжнар. навук. канф., Брэст, 16-18 чэрв. 2004 г. У 2-х частках.- Ч.1./рэдкал: М.П.Ярчак (адк.рэд/)[і інш.]. – Брэст: Изд-во Академия, 2004. - С. 347-352.

Абрамчук А.В. Белы бусел у Белавежскай пушчы. Кулён №2 (8) 2005.

Байчоров В.М., Гигиняк Ю.Г., Гигиняк И.Ю Новые находки видов, занесенных в Красную книгу Республики Беларусь и инвазия американского полосатого рака в водных объектах Национального парка «Беловежская пуща» // Красная книга Республики Беларусь: состояние, проблемы, перспективы: материалы

международной научной конференции, Витебск, 13-15 декабря 2011 г. – Витебск., 2011 г. – с. 7-9.

Ключевые ботанические территори Беларуси / Под ред. О.М. Масловского, Г.А. Пронькиной. – М.-Мн.-: Бестиор, 2005. – 80 с.

План управления Национальным парком “Беловежская пуща”. Книга 1. 2008 г.

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Дацкевіч В.А., Папенка В.М., Чэркас М.Д.).

Эколого-биологические особенности и устойчивость популяций редких видов растений Беловежской пущи. Денгубенко А.В., Парфенов В.И.Опубликовано на стр. 113 - 121.

Составители : Абрамчук А.В.

---

* *Использование размещенной здесь неопубликованной информации для научных публикаций без письменного соглашения ее авторов запрещено. В случае использования части контента или страницы целиком на других интернет-ресурсах, обязательна ссылка на авторов и сайт iba.ptushki.org*